*Ж. Л. РАМАНАВА*

# ПРАБЛЕМА КЛАСІФІКАЦЫІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

*Сярод сучасных падыходаў да класіфікацыі метасістэмы інфармацыйных рэсурсаў аўтар прапануе дзейнасна-інфармацыйны, згодна якому мастацкая літаратура разглядаецца адначасова і як від мастацтва, і як від інфармацыйнай дзейнасці. Перавагай дадзенага падыходу з'яўляецца магчымасць улічыць усе галіновыя рэсурсы, вызначыць іх месца і ўзаемасувязі, а таксама размежаваць тыя прыметы, па якіх мэтазгодна класіфікаваць рэсурсы мастацкай літаратуры, ад тых, па якіх класіфікаваць рэсурсы літаратуразнаўства.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важным пытаннем тэорыі інфармацыйных рэсурсаў (ІР), у тым ліку і ІР мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, з'яўляецца пытанне класіфікацыі, якая дазваляе ўстанаўліваць сувязі паміж кампанентамі ІР, арыентавацца ў іх разнастайнасці, выяўляць адрозненні паміж відамі ІР, выдзяляемымі па розных прыметах.

Існуе даволі значная колькасць шматаспектных класіфікацый першасных і другасных ІР, кожная з якіх выдзяляе ў якасці асноўных розныя іх асновы. Але праблемай з'яўляецца тое, што адзінства поглядаў на структурыраванне ІР сярод навукоўцаў няма. Розныя аўтары ў прапануемых класіфікацыях аддаюць перавагу тым ці іншым класіфікацыйным прыметам, вылучаюць розны іх склад.

Так, напрыклад, Н. Ю. Бярозкіна [4] прытрымліваецца погляду, што адной з найбольш значных прымет для класіфікацыі ІР з'яўляецца іх матэрыяльная канструкцыя.

А. Б. Антапольскі [2, 3] з кропкі гледжання крытэрыю інфармацыйнай бяспекі прапаноўвае ў якасці галоўных такія класіфікацыйныя прыметы, як змест інфармацыі, крыніца інфармацыйных рэсурсаў, прыналежнасць да інфармацыйнай ці арганізацыйнай сістэмы, форма ўласнасці, прызначэнне ІР, аб'ём ІР, адкрытасць ІР.

С. Н. Жукаў і Г.В. Фралоў [5, с.158–164] да гэтых прымет дадаюць даступнасць інфармацыі; форму яе прадстаўлення; мову прадстаўлення і абарону ІР.

Ю. М. Сталяроў распрацаваў класіфікацыю дакументных рэсурсаў і як найбольш значныя яе прыметы выдзеліў аб'ём; спосаб арганізацыі і прадстаўлення інфармацыі; ступень канцэнтрацыі інфармацыі; прыналежнасць рэсурсаў іх прататыпам; суб'ектаў – трымацеляў дакументнага рэсурсу; матэрыяльную форму прадстаўлення дакумента; дыяпазон функцыянавання дакументнага рэсурсу; ступень арганізаванасці дакументнага рэсурсу; месца дакументных рэсурсаў у дакументным працэсе [11, с.36–40].

Н. М. Кушнарэнка прапануе класіфікацыю дакументаў, згодна якой найбольш важнымі класіфікацыйнымі прыметамі для іх з'яўляюцца сутнасць дакументаў, іх інфармацыйная і матэрыяльная складаючыя, а таксама знешняе асяродзе іх функцыянавання [8, с.98–114].

Падобна на папярэднюю і класіфікацыя, прапануемая ў «Даведніку бібліёграфа» [10, с.28].

Падагульняе існуючыя падыходы да праблемы класіфікацыі ІР А. Б. Антапольскі ў працы «Інфармацыйныя рэсурсы Расіі» [1]. Аўтар прапануе агульны падыход да вырашэння праблемы. Заўважым, што даследчык разглядае не столькі параметры класіфікацыі ІР, як параметры «апісання» інфармацыйных масіваў, прычым з пункту гледжання карыснасці іх для «ідэнтыфікацыі» азначаных масіваў. Але тэрміны «апісанне», «ідэнтыфікацыя», «класіфікацыя» не з'яўляюцца тоеснымі. Аўтар не ўдакладняе, ці размяжоўвае ён гэтыя пытанні, прычым складана вычленіць тыя параметры, якія адносяцца ім да апісання масіваў, і тыя, якія адносяцца да класіфікацыі. Калі пакінуць ў баку тэрміналагічныя праблемы, то можна пагадзіцца з аўтарам, што практычна немагчыма скласці агульную ўніверсальную мадэль ідэнтыфікацыі, якая б аднолькава падыходзіла для ўсіх відаў інфармацыйных аб'ектаў. Больш правільным з'яўляецца падыход, згодна якому выдзяляюцца некалькі агульных універсальных прымет, прымальных для ўсіх ІР увогуле, а потым распрацоўваюцца мадэлі класіфікацыі для розных відаў ІР, а таксама для рознай глыбіні, паўнаты і дакладнасці іх апісання [1, с.23–25].

Агульныя метаданыя, якія можна ўмоўна лічыць універсальнымі для апісання ўсіх інфармацыйных масіваў і ІР, А. Б. Антапольскі падзяляе на неабходныя (асноўныя) і дадатковыя (якія выкарыстоўваюцца толькі ў пэўных сітуацыях). Да неабходных ён адносіць назву ІР; прыналежнасць ІР да сістэмы; змест; від крыніцы. Дадатковымі фасетамі аўтар лічыць форму ўласнасці; прызначэнне; аб'ём; адкрытасць (даступнасць); форму прадстаўлення; від носьбіта; спосаб распаўсюджвання [1, с.25]. Трэба адзначыць, што прыведзеныя А. Б. Антапольскім метаданыя ІР сапраўды больш прымальныя для апісання і для ідэнтыфікацыі інфармацыйных масіваў. Калі ж гаварыць аб іх класіфікацыі ў чыстым выглядзе, думаецца, склад неабходных і дадатковых параметраў можа выглядаць некалькі іначай. Тут яшчэ трэба падкрэсліць, што выдзяленне неабходных і дадатковых крытэрыяў носіць умоўны характар. Некаторыя дадатковыя параметры ў дачыненні да асобных інфармацыйных масіваў ці ІР становяцца неабходнымі, і наадварот [1, с.25–26]. Разгледзім гэта ў дачыненні да інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (ІРМЛЛ). На нашу думку, неабходныя для іх параметры класіфікацыі мэтазгодна разглядаць на трох узроўнях: 1) фармальным; 2) функцыянальным; 3) змястоўным. І тады іх склад будзе выглядаць наступным чынам:

I) фармальныя: від носьбіта ІР – рэчавы (традыцыйны), энергетычны (электронны); форма прадстаўлення інфармацыі – тэкставая, гукавая, лічбавая, мультымедыйная і інш.;

II) функцыянальныя: грамадскае прызначэнне ІР – прымета, якая дае магчымасць дыферэнцаваць ІР у залежнасці ад мэт іх выкарыстання і чытацкага прызначэння;

III) змястоўныя: змест ІР – дае магчымасць вылучаць і падраздзяляць ІР у адпаведнасці з тэматыкай, галіной, краінай ці рэгіёнам, асобай пісьменніка.

Выдзяленне прыведзеных фармальных крытэрыяў у якасці неабходных выклікана рэаліямі XXI ст. Сёння мы маем справу не толькі з рэсурсамі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства на традыцыйных (папяровых, плёначных, дыскавых) носьбітах, але і з аблічбаванымі творамі на электронным носьбіце, з мультымедыйнымі прадуктамі на DVD, CD-ROM, у прасторы Інтэрнэт, таму ігнараванне гэтых класіфікацыйных прымет прывядзе да недакладнай інфармацыі аб якасных і колькасных характарыстыках ІР. Акрамя таго, вылучэнне ІР па названых крытэрыях важна пры вызначэнні доступу да іх, вывучэнні рэсурсаў, вырашэнні магчымасці іх набыцця і г.д.

Прыярытэтнымі функцыянальнымі і змястоўнымі прыметамі для ІРМЛЛ з'яўляюцца прыметы грамадскага прызначэння і зместу інфармацыі. Гэта відавочна, бо «кожны літаратурны твор, маючы пэўнае грамадскае прызначэне, дапускае выкананне якой-небудзь (больш ці менш выразна ўсвядомленай і сфармуляванай) функцыі і арыентуецца на пэўную чытацкую аўдыторыю» [7, с.11], таму і класіфікацыя па прымеце грамадскага прызначэння дазваляе выдзяляць ў асобныя групы дакументы, прызначаныя для спецыялістаў розных сфер дзейнасці ў галіне мастацкай літаратуры, для аматараў літаратуры, для дзяцей, юнацтва, дарослых, што дае магчымасць аналізаваць масівы і мадэляваць патокі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, а таксама дапамагае абслугоўванню карыстальнікаў і самастойнаму выбару літаратуры чытачамі, робіць выбар больш асэнсаваным і мэтанакіраваным.

Пералічаныя фасеты трэба прызнаць неабходнымі, бо яны дазваляюць вызначыць мэтанакіраванасць, унутраны змест, а таксама форму прадстаўлення інфармацыі, ацаніць мэтазгоднасць выкарыстання ІРМЛЛ, рэлевантнасць патрабаванням карыстальнікаў і, акрамя таго, тэхнічныя магчымасці доступу да іх.

Такія фасеты, як назва рэсурсаў, аб'ём, форма прадстаўлення, форма ўласнасці, прыналежнасць да сістэмы, больш падыходзяць да іх апісання і могуць ужывацца ў пэўных сітуацыях, але неабходнымі пры класіфікацыі не з'яўляюцца.

Асаблівасцю класіфікацыі любых галіновых рэсурсаў, у тым ліку і ІРМЛЛ, з'яўляецца ўздзеянне на склад класіфікацыйных прымет спецыфікі таго віду дзейнасці, да якога адносяцца тыя ці іншыя рэсурсы. Так, класіфікацыйныя прыметы ІРМЛЛ вызначаюцца спецыфікай твораў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, але, акрамя гэтага, і спецыфікай таго віду дзейнасці, у якім узнікаюць і існуюць. Гэта з'яўляецца падставай для пабудовы класіфікацыі ІРМЛЛ на аснове метасістэмнай класіфікацыі, але зыходзячы са спецыфікі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства і прымяняючы ў якасці асноўнага дзейнасна-інфармацыйны падыход [12].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згодна з гэтым падыходам, мастацкая літаратура мае дваістую сутнасць. З аднаго боку, гэта від мастацтва, а з другога – від інфармацыйнай дзейнасці, а таму ўключае два кмпаненты – інфармацыйны і дзейнасны, кожны з якіх генерыруе шматлікія інфармацыйныя рэсурсы [12, с.5]. Гэта тлумачыцца тым, што «кожная грань жыццятворчай актыўнасці чалавека, а тым больш мастака, параджае інфармацыйна-энэргетычны ўсплёск (інфармацыю), пераўтвараемы потым у матэрыяльную форму і называемы тэкстам, творам, дакументам, інфармацыйным рэсурсам» [14, с.266].

Інфармацыйны кампанент прадстаўлены творамі мастацкай літаратуры – асноўнымі інфармацыйнымі рэсурсамі дадзенай сферы мастацтва. Творы мастацкай літаратуры можна класіфікаваць, узяўшы за аснову марфалогію мастацтва па класах, сямействах, родах і жанрах: клас – часовыя; сямейства – слоўныя; від – вусная літаратура, пісьмовая літаратура; род – эпас, лірыка, драма; жанр – эпас: раман-эпапея, раман, аповесць, апавяданне; лірыка: паэма, элегія, ода, санет, балада і інш.; драма: уласна драма, трагедыя, камедыя, меладрама і інш. [7, с.6–8]. Родавае і жанравае дзяленне мастацкай літаратуры выкарыстоўваецца ў працэсе вывучэння і задавальнення попыту на літаратурна-мастацкія выданні, пры фарміраванні ІР бібліятэк, бібліяграфічнай дзейнасці. Так, вядома, што найбольшым попытам ва ўсіх групах сучасных чытачоў традыцыйна карыстаюцца эпічныя творы, галоўным чынам – раманы і аповесці (дэтэктыўныя, любоўныя, фантастычныя, гістарычныя). Значна меншы попыт на лірычныя творы – у большасці ў чытачоў з дастаткова высокім узроўнем адукацыі, устойлівым інтарэсам да гуманітарных ведаў. Вузкая аўдыторыя ў драматычных твораў: вучні, студэнты і выкладчыкі ў першую чаргу тэатральных навучальных устаноў, дзеячы і аматары тэатра [7, с.9]. Гэтыя веды становяцца падставай для складання планаў выдавецкай дзейнасці, пры вызначэнні тыражу выданняў, пры заказе і набыцці літаратуры для фондаў бібліятэк. Акрамя таго, той ці іншы жанр твора ўздзейнічае на тып выдання, што праяўляецца ў характары падрыхтоўкі тэксту, складзе выдання, яго аб’ёме, структуры, характары даведачнага апарату, афармленні выдання, паліграфічным выкананні [15, с.98].

Прынцыповым пры структурыраванні і прадстаўленні ІР з’яўляецца таксама дзяленне па нацыянальных літаратурах і асноўных перыядах развіцця. Гэтыя прыметы, а таксама родавае і жанравае дзяленне літаратуры ўжываюцца пры выданні літаратурна-мастацкіх серый (напрыклад, «Беларуская проза ХХ стагоддзя», «Беларускі раман», «Бібліятэчка беларускай прозы» і г.д.), пры стварэнні анталогій і іншых зборнікаў, у бібліятэчна-бібліяграфічных класіфікацыях, пры распрацоўцы літаратурных сайтаў і інш. [10, с.146].

Мастацкая літаратура, уваходзячы ў структуру мастацтва, адначасова існуе і як пэўны від інфармацыйнай дзейнасці. Таму пры пабудове класіфікацыі «неабходна зыходзіць з вядомых і тых, што з’яўляюцца, відаў і спецыфікі дзейнасці крэатараў канкрэтнага віда мастацтва, паколькі кожная яе грань, кожны яе аспект «нараджае» інфармацыю, інфармацыйны рэсурс» [13, с.45] , якія трэба ўлічыць і пэўным чынам упарадкаваць.

Класіфікацыю ІРМЛЛ, як вынік пэўнага віду дзейнасці, трэба будаваць зыходзячы са структуры інфармацыйнай дзейнасці ў галіне мастацкай літаратуры. Узорам тут служыць падыход Т. М. Сумінавай [14, с.268], якая прапанавала вызначаць структуру дзейнасці сферы мастацтва, абапіраючыся на агульную відавую структуру інфармацыйнай дзейнасці, прапанаваную Ю. С. Зубавым: 1) інфармацыйна-творчая дзейнасць, якая ўключае мастацка-крэатыўную, навукова-даследчую, крытыка-публіцыстычную разнавіднасці; 2) інфармацыйна-рэпрадукцыйная, якая ўключае навукова-асветніцкую і папулярызатарскую разнавіднасці; 3) інфармацыйна-карыстальніцкая, якая ўключае перцэптыўную (ці эстэтычную) разнавіднасць (яна праяўляецца як патрэбнасць у прыгожым, у мастацтве); пазнавальную (яна праяўлаецца як патрэбнасць у дакладных ведах); каштоўнасна-арыентацыйную (праяўляецца як патрэбнасць у каштоўнасных установках) [6, с.16]. Згодна з гэтым, да твора мастацкай літаратуры маюць дачыненне не толькі пісьменнік як яго творца, але і навукоўцы, якія даследуюць твор, і крытыкі, якія даюць яму ацэнку (інфармацыйна-творчая дзейнасць); выкладчыкі, рэдактары, бібліёграфы, работнікі органаў інфармацыі, якія займаюцца папулярызацыяй твора, знаёмяць з ім карыстальнікаў (інфармацыйна-рэпрадукцыйная дзейнасць); а таксама карыстальнікі, для якіх «спажыванне інфармацыі звязана ў першую чаргу з яе «распрадмечваннем»... інакш кажучы, з успрыняццем і «прысваеннем» [14, с.268] (інфар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мацыйна-карыстальніцкая дзейнасць). Такім чынам, пабудова класіфікацыі ІРМЛЛ «дэтэрмінуецца актыўнасцю персон, занятых у гэтай галіне чалавечай дзейнасці – няхай гэта аўтар, выканаўца, інтэрпрэтатар, крытык, аматар мастацтва» [14, с.275]. Таму важна пры класіфікацыі ІРМЛЛ улічыць усе віды інфармацыйных рэсурсаў, якія звязаны з мастацкім творам і творчай лабараторыяй пісьменніка, дзейнасцю па яго даследаванні, вывучэнні, папулярызацыі, распаўсюджванні і спажыванні, і на гэтай аснове будаваць класіфікацыю названых рэсурсаў, што дазволіць «найбольш поўна разглядаць усе грані інаватыўнага працэсу крэатара, вычляняць і ўлічваць усе ствараемыя ім і ўзнікаючыя вакол яго інфармацыйныя рэсурсы» [14, с.276].

На падставе вышэйсказанага прапануем выдзеліць два асноўных кампаненты класіфікацыі ІРМЛЛ у адпаведнасці з той галіной дзейнасці, у якой яны ўзніклі: 1) ІР мастацкай літаратуры і 2) ІР літаратуразнаўства. У межах гэтых кампанентаў неабходна градацыя дакументаў на першасныя і другасныя. Пры вызначэнні гэтых паняццяў мы прытрымліваемся бібліяграфічнага падыходу, згодна з якім «усе творы пісьменства і друку, змест якіх не зводзіцца да бібліяграфічнай інфармацыі ... адносяцца да першасных, а бібліяграфічная прадукцыя – да другасных дакументаў» [9, с.127–128]. Да другасных дакументаў таксама павінны аднесці аглядную і рэфератыўную інфармацыю, якая, як і бібліяграфічная, з’яўляецца вынікам перапрацоўкі першасных дакументаў. Бібліяграфічны падыход дазваляе выдзеліць два ўзроўні дакументнай камунікацыі [9, с.128], да якой належыць і мастацкая літаратура: першасны дакументны ўзровень – рукапісныя, апублікаваныя і непублікуемыя дакументы з адпаведнымі каналамі. Гэты ўзровень – галіна бібліятэчнай, архіўнай, музейнай дзейнасці; другасны дакументны ўзровень – рукапісныя бібліяграфічныя матэрыялы, бібліяграфічныя выданні, бібліяграфічныя базы машыначытальных даных, аглядныя і рэфератыўныя выданні. Гэты ўзровень – галіна бібліяграфічнай і інфармацыйнай дзейнасці.

Такім чынам, класіфікацыю ІРМЛЛ з улікам вышэйсказанага можна прадставіць наступным чынам:

1) ІР мастацкай літаратуры (ІРМЛ) – першасныя і другасныя дакументы.

Першасныя дакументы – творы мастацкай літаратуры як асноўныя інфармацыйныя прадукты галіны, у тым ліку падрыхтоўчая інфармацыя (чарнавікі, варыянты рукапісаў, накіды, карэктуры, гранкі, тэмы, фразы, сказы, варыянты дыялогаў, сюжэтныя лініі твора, дзённікі, запісныя кніжкі, планы, малюнкі і г.д.). Для даследчыкаў творчасці пісьменнікаў падрыхтоўчая інфармацыя з’яўляецца важным матэрыялам, які дазваляе ў поўным аб’ёме вывучаць творчасць аўтара, прасачыць увесь працэс стварэння твора – ад узнікнення замыслу да яго рэалізацыі. Акрамя таго, падрыхтоўчая інфармацыя з’яўляецца непасрэдным аб’ектам вывучэння такой дапаможнай літаратуразнаўчай дысцыпліны, як тэксталогія, якая даследуе гісторыю таго ці іншага тэксту і яго крыніцы. З дапамогай параўнання розных варыянтаў тэксту твора, супастаўлення ідэнтычнасці друкаванага тэксту з аўтографам тэкстолагі выпраўляюць тэкст твора, аднаўляюць лакуны ў ім, што ўзніклі не па волі аўтара. Такая праца дазваляе пранікнуць у творчую лабараторыю пісьменніка, прасачыць эвалюцыю яго майстэрства, а таксама прыводзіць да выдання тэкстаў, найбольш поўна набліжаных да аўтографа, дапамагае ўстанавіць яго датыроўку, забяспечыць каментарыем і даведачным апаратам.

Другасныя дакументы – гэта бібліяграфічная інфармацыя: рэкамендацыйныя і навукова-дапаможныя бібліяграфічныя дапаможнікі.

2) ІР літаратуразнаўства (ІРЛ) – першасныя і другасныя дакументы.

Першасныя дакументы – літаратуразнаўчая інфармацыя: навуковая, навукова-папулярная, вучэбная, даведачная; без яе немагчыма вывучэнне літаратурнага працэсу, асэнсаванне літаратурнай спадчыны, яе ўзаемадачынення да грамадскага жыцця і мастацтва ў цэлым.

Другасныя дакументы – бібліяграфічная інфармацыя: навукова-дапаможныя і вучэбна-дапаможныя бібліяграфічныя паказальнікі, а таксама рэфератыўная і аглядная інфармацыя, ствараемая органамі інфармацыі.

Як бачым, згодна з дзейнасна-інфармацыйным падыходам, ІР мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства падзяляюцца на два комплексы, якія ўключаюць усе ствараемыя ў гэтай галіне ведаў ІР. Перавагай дадзенай класіфікацыі з’яўляецца тое, што яна дае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымасць выдзеліць у асобныя комплексы ІРМЛ і ІРЛ, што дазваляе выявіць іх спецыфіку, а гэта для даследуемай галіны мае важнае значэнне. Справа ў тым, што названыя рэсурсы вельмі адрозніваюцца паміж сабой па характары тых ведаў, якія яны ўтрымліваюць. Калі ІРМЛ уяўляюць сабой мастацка-вобразныя веды, разлічаныя на пазнанне навакольнай рэчаіснасці з дапамогай мастацкіх вобразаў, якія маюць ідэальна-суб'ектыўны характар і прызначаны галоўным чынам для эмацыянальнага ўспрымання чытачом, то ІРЛ утрымліваюць навуковыя веды, дабытыя не толькі і не столькі пачуццёвым спосабам, а абстрактным мысленнем і разлічаныя на інтэлектуальнае іх успрыманне. Гэта з'яўляецца прычынай пэўнай розніцы ў складзе і змесце класіфікацыйных прымет, па якіх дыферэнцуюцца ў далейшым ІРМЛ і ІРЛ.

Маюць сваю спецыфіку і другасныя ІР дадзенай сферы. Калі ў галіне мастацкай літаратуры існуе толькі бібліяграфічная інфармацыя (сігнальная і анатаваная), то па літаратуразнаўстве, акрамя бібліяграфічнай, можа ствараецца рэфератыўная і аглядная навуковая інфармацыя.

Далейшую класіфікацыю ІРМЛЛ можна ажыццяўляць у межах двух выдзеленых комплексаў па іншых прыметах – як агульнаметасістэмных (фармальных, функцыянальных і змястоўных, прычым з улікам спецыфікі галіновых рэсурсаў), так і спецыфічных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


1. *Антопольский, А. Б.* Информационные ресурсы России / А. Б. Антопольский. – М.: Либерея, 2004. – 424 с.

2. *Антопольский, А. Б.* Проблемы классификации информационных ресурсов по критериям информационной безопасности / А. Б. Антопольский // ИР России. – 1997. – № 6. – С. 7–12.

3. *Антопольский, А. Б.* Проблемы классификации информационных ресурсов / А. Б. Антопольский // НТИ. Сер. 1. – 1997. – № 8. – С. 1–12.

4. *Березкина, Н. Ю.* Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси / Н. Ю. Березкина, Л. А. Авгуль, Б. Б. Невский. – Минск: Красико-Принт, 2002. – 144 с.

5. *Жуков, С. Н.* Перечень подлежащих защите совместно используемых информационных ресурсов Союзного государства Беларуси и России / С. Н. Жуков, Г. В. Фролов // Управление защитой информации. – 2001. – Т. 5. – № 2. – С. 158–173.

6. *Зубов, Ю. С.* Библиография и художественное развитие личности: монография / Ю. С. Зубов. – М.: Книга, 1979. – 144 с.

7. *Караиченцева, С. А.* Книговедение: литературно-художественная и детская книга. Издания по филологии и искусству: учеб. для вузов / С. А. Караиченцева. – М.: МГУП, 2004. – 424 с.

8. *Кушнаренко, Н. Н.* Документоведение / Н. Н. Кушнаренко. – 4-е изд., испр. – Киев: Знання: КОО, 2003. – 459 с. – (Высшее образование XXI века).

9. *Соколов, А. В.* Метатеория социальной коммуникации / А. В. Соколов. – СПб.: РНБ, 2001. – 352 с.

10. *Справочник* библиографа / науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – СПб.: Профессия, 2002. – 528 с. – (Библиотека).

11. *Столяров, Ю. Н.* Документный ресурс: учеб. пособие для студ. вузов / Ю. Н. Столяров. – М.: Либерея, 2001. – 149 с.

12. *Суминова, Т. Н.* Морфология информационных ресурсов сферы искусства: к постановке проблемы / Т. Н. Суминова // Мир библиографии. – 1998. – № 4. – С. 4–6.

13. *Суминова, Т. Н.* Информационные ресурсы художественной культуры (артосферы) / Т. Н. Суминова. – М.: Академический проект, 2006. – 480 с. – (Технологии культуры).

14. *Суминова, Т. Н.* Художественная культура как информационная система (мировоззренческие и теоретико-методологические основания) / Т. Н. Суминова. – М.: Академический проект, 2006. – 383 с. – (Технологии культуры).

15. *Типология* изданий. – М.: Книжная палата, 1990. – 231 с.

*J. ROMANOVA*

**THE PROBLEM OF THE INFORMATION RESOURCES OF ARTISTIC LITERATURE AND LITERARY STUDIES' CLASSIFICATION**

The article of J. Romanova considers modern approaches to the issue of the information resources' classification metasystem. The author proposed the solution of the problem of the information resources of artistic literature and literary studies classification using an effective informational approach according to which the artistic literature is considered simultaneously as a form of art, and as a type of information activities for which the presence of various information resources is typical. The advantage of the proposed approach is the possibility to account all the resources of the branch, determine their places and interrelations, as well as the possibility to differentiate the signs according to which it is possible to classify the resources of artistic literature from those ones according to which it is advisably to classify resources of literary studies.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 17.02.2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ